**27. ІВАН-ХУАН**

Прытча – вевялікі твор павучальнага характару. У старажытнасці, калі людзі былі раз'яднанымі, прытча існавала як дакументальна-міфалагічная гісторыя на маральную ці рэлігійную тэму. Прытча ў значнай ступені замяняла палітыку, у адносінах паміж людзьмі было больш натуральнасці. Прытчы перадаваліся ад пакалення да пакалення як закон быцця.

Узорная прытча – Біблія. Каб ведаць ўсё пра жыццё-быццё, чалавеку дастаткова Вялікай Прытчы. Таму што ўсё ўжо было, усё адбылося паміж людзьмі, якія падзяліліся на дзве антаганістычныя часткі – начальнікі і падначаленыя. Каб добра склалася жыццё, трэба маліцца за ўсіх людзей, але найперш за начальнікаў, бо ад іх зыходзяць голад, холад, няшчасці, войны. Гэта – з Бібліі. Першае пасланне да Цімафея святога апостала Паўла.

Галоўная небяспека, якая зыходзіць ад начальнікаў усіх часоў і народаў, у тым, што яны аб'ядноўваюць падначаленых у партыі, саюзы, блокі. Раней кожны чалавек грашыў паасобку, меў магчымасць у адзіноце пакаяцца, ачысціцца душой. Цяпер людзі грашаць і паасобку, і усёй бязлікай масай. Каб апраўдацца, маса выпрацоўвае сістэму ілжывых аргументаў, якая завецца – палітыка. Таму палітыка ніколі не была і не будзе існай дзейнасцю, чыстай дзейнасцю.

Палітыка не ведае пакаяння. Яна ігнаруе чалавека з яго прыроджанай схільнасцю да самаўдасканалення, да прытчы, якой трэба давярацца. У прытчы – тое, што было. Прытчу нельга абвергнуць, таму што нельга знайсці контрафактаў.

Каб аспрэчваць прытчу, факты трэба замяніць палітычнай фразеалогіяй. Мне, напрыклад, гавораць: без меліярацыі беларусы памерлі б з голаду. Я пытаюся: чаму беларусы не памерлі раней, калі не было татальнай меліярацыі? Мне пнуцца даказаць: чалавек не павінен залежыць ад прыроды, балота, чалавек без веры ў свае тэхнакратычныя магчымасці – не чалавек. Я падхопліваю, дапаўняючы неаспрэчным фактам: на Палессі, у Горску, чалавек ужо не можа прыняць Веру, таму што не стала вады, баптыстам няма дзе акунуцца, каб прыняць хрышчэнне.

Каб не весці бясплодныя дыскусіі з палітызаванай масай і з палітыкамі-дэмагогамі, я вырашыў напісаць некалькі прытчаў. Паспрабуйце дакажыце, што маёй аўтабіяэкалагічнай гісторыі не было! Раскажу, як палітыка амаль стагоддзе душыла і прадаўжае душыць мой род.

Вёска Горск, як ведае чытач, стаіць пры еўрапейскім бальшаку Масква-Мінск-Брэст-Варшава-Берлін-Парыж. Таму яна ўвесь час у дарозе. У 1914 годзе вёска, ратуючыся ад кайзераўскага войска, пагрузілася на падводы і пацягнулая амаль за пяцьсот кіламетраў, у Полацк. Мая будучая бабуля, чатырнаццацігадовая Ганна Казловіч, прайшла гэты шлях пешкі. На калёсах сядзелі толькі старыя і малыя.

У Полацку Ганна ўладкавалася ў чырвонаармейскім шпіталі, дзе яе ўбачыў салдат Іван Міфодзьеў, ураджэнец Самары. Калі пасля Рыжскага дагавора (1921) вёска сабралася на радзіму, якую палітыкі ўжо зрабілі Польшчай, самаранін

вырашыў сваю радзіму, Расію, пакінуць. Дзеля кахання ён стаў здраднікам, а мая бабуля парушыла вясковую мараль, бо аддалася майму дзеду без бласлаўлення бацькі-маці. Не дызерціруй закаханы салдацік з Чырвонай арміі, праз паўгода яго расстралялі б, як расстралялі ў Самары ўсю ягоную радню "за супраціўленне савецкай уладзе" (Міфодзьевы былі зажытачнай сям'ёй, мелі ўласную справу).

Праз савецка-польскую мяжу майго будучага дзеда перавезлі ў мяшку, на якім у шырокай спадніцы сядзела, тузаючы лейцы, мая будучая бабка. Так карэнная беларуска стала Міфодзьевай, а па вясковай мянушцы – Кацапкай.

Маладой сям'і на абжыванне ў Горску бацькі выдзелілі крыху зямлі, чым застаўся незадаволеным старэйшы бабчын брат Ігнат. Ён хацеў, каб уся зямля сям'і Казловічаў дасталася яму, бо ўклаў у яе многа ўласных сіл і сродкаў (двойчы ездзіў на заробкі ў Амерыку). Каб спраўдзіць запаветную мару аб сваёй зямельцы, селянін зрабіўся палітыкам. Заявіў польскім уладам, што ў Горску нелегальна жыве і дзейнічае савецкі шпіён.

Польскія ўлады пасадзілі дзеда ў пружанскую турму. Пратрымалі тры месяцы, дапытвалі. Напэўна, зразумелі, што ніякі ён не шпіён. Але рашэнне прынялі жорсткае: загадалі адпраўляцца ў Расію.

Дзед узяў на плечы сваю шавецкую машынку, пад руку гармонік, бабка пасадзіла на карак гадавалую дачку, маю будучую маці, і пайшлі яны двесці кіламетраў у Стоўбцы, да мяжы.

Палякі праз мяжу прапусцілі, а чырвоныя гавораць: нам дызерціры не патрэбныя. Калі вельмі хочаш, то ідзі, чэка з табой мігам разбярэцца.

Дзед вырашыў вяртацца ў Польшчу, а палякі – не пускаюць. Тыдзень сям'я тулілася ў прыгранічным лесе, паміж дзвюма палітычнымі сістэмамі. Пакуль дзед Іван не знайшоў дзірку ў польскіх пагранічнікаў.

Маці пасля расказвала мне так:

"І пабеглі мы ў Польшчу. Прыбеглі ў нейкую вёску: схавайце нас, людзі добрыя! Нас схавалі ў склепе. А я паміраю. Мяне на граніцы прастудзілі, паміраю ў цёмным склепе. Ратуюць мяне тыя людзі, нясуць малако, бульбачку. А бацька думае: у якую краіну ісці?"

Сям'я вярнулася ў Горск: больш не было куды. А тут – старэйшы бабчын брат, заўзяты селянін-уласнік, дамарослы палітык. За сваю зямлю ён гатовы на ўсё. Данёс палякам, што шпіён вярнуўся. Не пашкадаваў малодшую сястру і яе дзіця.

Прыходзіць паліцэйскі, зноў забірае дзеда ў турму. Польскі ўрад гэтым разам праявіў да дзеда гуманнасць, прапанаваў: або згнієш у турме, або бяры польскае падданства. Дзед – узяў. І застаўся жывы, не ляжыць зараз у Курапатах, дзе ляжаць палітызаваныя перабежчыкі з заходняй, капіталістычнай, Беларусі ў усходнюю, сацыялістычную.

У 1929 годзе Міфодзьеў вырашыў ехаць у Паўднёвую Амерыку. Да таго часу ён з бабкай нарадзілі чацвёра дзяцей, пабудавалі ў Горску хатку з палавінчыкаў сторчма. Сталі баптыстамі. Іван не піў і не граў. Толькі шыў і шыў, каб сям'я не памерла з голаду. Для годнага жыцця не хапала аднаго – сваёй зямлі. Каб

займець зямлю, аснову жыцця, сям'я павінна была на нейкі час разлучыцца. Паездка ў Амерыку на заробкі была ў Горску справай будзённай.

Маці расказвала так:

"Мне было пяць гадкоў, малодшанькаму нашаму – год. Не ведаю, якой тады была мая мама, ці смелая, ці дурная. Чаму адпусціла мужа? Памятаю, яна загаласіла, калі бацька сеў на воз ехаць на станцыю".

У Аргенціне дзед Іван знайшоў працу на будаўніцтве чыгункі праз джунглі. Падзарабіўшы, перабраўся ў Буэнас-Айрэс. Спачатку прадаваў вараную кукурузу, збіраў капітал на больш сур'ёзную справу. Адкрыў шавецкую майстэрню. Наняў работніка. Справа развівалася. У Горск, сям'і, Іван пасылаў грошы, але мала. Напэўна, як сапраўдны капіталіст укладваў прыбытак у развіццё прадпрыемства. Сям'я ў Горску бедавала.

У 1938 годзе Міфодзьеў напісаў дамоў, каб старэйшая дачка, мая маці, і малодшы сын ехалі да яго. Перад тым маці павінна была навучыцца шыць. План Міфодзьева быў наступны: разам з дачкой ён працуе ва ўласнай майстэрні. Прыбытак рэзка павялічваецца. Пасылаюць грошы на дарогу другой частцы сям'і. Бабка з дваімі дзецьмі едуць за акіян – і Міфодзьевы па сваёй волі, без аніякага прымусу з боку, навекі пасяляюцца ў Буэнас-Айрэсе. Там, дзе лепш, чым у Горску.

Шыць мая маці навучылася ў суседняй вёсцы. Грошай на навуку не было, таму нанялася служыць у вучыцелькі па гаспадарцы. І далей маці апавядала так:

"Вывучылася я. Мне пятнаццаць гадоў. Кручуся ў Пружане каля магазіна, гляджу праз акно на шляпкі. Думаю: вось такую я хутка куплю ў Буэнас-Айрэсе".

Дзяўчынка не ведала, што месца яе жыхарства палюбоўна вызначана двума вялікімі фашыстамі дваццатага стагоддзя – Гітлерам і Сталіным. У 1939 годзе ў Горск прыйшлі Саветы, выезд маёй маці ў Аргенціну забаранілі. На якой падставе? Чаму чалавеку не дазволілі жыць там, дзе ён хоча? Навошта захопнікі навекі разлучылі Івана Міфодзьева з жонкай, трыма сынамі, дачкой?

Наіўныя, вядома, пытанні. Маленькія. Таму што палітыкі распачалі небывалую ў гісторыі чалавецтва гульню – другую сусветную вайну. Яна распарадзілася лёсам майго роду на свой капыл.

У 1942 годзе фашысцкія захопнікі (нямецкія) вывезлі маці ў Германію. Следам там жа апынуўся бацька (жанатымі яны яшчэ не былі, але ўжо кахаліся).

У Горск яны вярнуліся ў 1945 годзе і ўвосень пажаніліся. Наступнай восенню, у 1946-м, у іх з'явіўся я.

Пасля вайны дзед прыслаў з Аргенціны ліст: хутчэй прыязджайце! Ён не ведаў, што вайна забрала двух сыноў (падарваліся на міне ў горскім лесе). Справы ў дзеда ішлі няблага. Зарабляў шавецкай справай. Падрабляў таксістам, меў свой аўтамабіль. Стварыў у прыгарадзе Буэнас-Айрэса суполку баптыстаў, быў прэсвітэрам.

Далей няхай апавядае маці:

"Але твой бацька, сынок, учапіўся за зямлю. Дастаўся нам кавалак пяску ў Жомцы, над балотам. Бацька там здумаў разбагацець. Нікуды не хацеў ехаць з Горска. Маглі б паехаць у Буэнас-Айрэс, пакуль Саветы тут не ачомаліся ад

вайны. Маглі б завербавацца ў Кёнігсберг, Калініград, куды паехалі некаторыя нашы людзі. Калі б не засталіся ў Горску, то, можа, жыццё не было б такое гаротнае. Зямлю ў нас адабралі ў 1949 годзе, калі ў Горску стаў калгас. Засталіся ні з чым".

Годам раней, у 1948-м, з арміі прыйшоў малодшы мамін брат, Мікалай Міфодзьеў. Ён паспеў і паваяваць, і атруціцца сталінскай палітыкай. Даведаўшыся, што з бацькам узнавілася перапіска, франтавік-камсамолец употай ад усіх паслаў яму злы ліст: ты нам не бацька, бо ты капіталіст, абыдземся без цябе.

Дзед замаўчаў.

Прайшло два дзесяцігоддзі, перш чым сын вызваліўся ад дурману сталіншчыны і з болем успомніў, што ў яго ёсць родны бацька. У Буэнас-Айрэс паслалі некалькі пакаянных лістоў – адказу не атрымалі. Івана Міфодзьева шукалі праз Міжнародны Чырвоны крыж – нічога пэўнага не даведаліся. Хацелі паслаць каго-небудзь з роду на пошукі, але не змаглі сабраць грошай на білет.

Я шукаў дзеда праз эміgranцкае радыё Аргенціны, праз баптысцкія саюзы, праз беларусаў-эмігрантаў. Вынікаў няма аніякіх. Дзед Іван прапаў. Мне застаецца толькі радавацца, што ён меў маю фотакартку, дзе мне адзін год і адзінаццаць месяцаў, што дзед загадаў мяне ахрысціць (ахрысцілі).

Палітыка, як пракляцце, прыгнятала мой род на працягу дваццатага стагоддзя: дыктавала, дзе жыць, дзе нарадзіцца нашым дзцям, якому богу верыць, што думаць, што рабіць. Толькі адзін з нас пажыў свабодным – дзед Іван. Хуан, як падпісваў ён свае лісты. Сваю свабоду Хуан здабыў надта вялікай цаной.

Раней, як збярэцца наша радня за святочным сталом, дык абавязкова ўспомніць пра дзеда Хуана: дзе ён зараз? Нехта скажа: памёр, напэўна, столькі ж гадоў прайшло. А, можа, недзе нашы аргенцінскія родзічы жывуць, скажа нехта за сталом. Не мог жа мужчына ў 48 год не ажаніцца. О, вядома, ажаніўся, нарабіў нам сваякоў, да гэтай справы ён быў ахвочы. Не грашыце, Іван – веруючы, баптыст. Дык рабіць дзяцей – божая справа. Трэба камусьці з'ездзіць у Аргенціну, пазнаёміцца са сваякамі. А за які кукіш ехаць? Нам тут усім колькі гадоў трэба працаваць, каб зарабіць на дарогу ў Буэнас-Айрэс?

Усе замаўкаюць, пачынаюць лічыць наш агульны заробак. І дружна жахаюцца сваёй беднасці.

Дзед Хуан (Іван) на дарогу ў Аргенціну хутка зарабіў вясковым шаўцом. Старэйшы бабчын брат, той самы, што двойчы саджаў дзеда ў турму, ездзіў у Амерыку двойчы. Значыць, у дваццатыя гады ў Горску жылі весялей, калі маглі захацець і свабодна з'ездзіць за акіян, свабодна вярнуцца ці застацца.

Беднасць народа – найхітрэйшая палітыка савецкай дзяржавы. Беднасць усталёўвае народу рабства. І нават Айчыну.

1994-2005